Сычова, І.С. Дыферэнцыяцыя зместу эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы / І.С. Сычова // Традыцыйная культура і дзеці : праблемы этнавыхавання : матэрыялы IV рэспубліканскай навук.-практ. Канф., Акцябрскі, 2-3 крас. 2008 г., / БелДІПК ; аўт. Праекта і ўклад. М.А. Козенка. – Мінск, 2008. – Вып. 3. – С. 80–84.

# ДЫФЕРЭНЦЫЯЦЫЯ ЗМЕСТУ ЭСТЭТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІЦЫ

І.С. Сычова

Змест эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы ахопліваў многія аспекты, быў шматфункцыянальным і прадугледжваў веданне асноўных эстэтычных цыклаў народнай творчасці, засваенне народнага этыкету, авалоданне ведамі і навыкамі ў галіне народных рамёстваў. У яго ўваходзілі: каляндарна-абрадавая паэзія, якая падзяляецца на зімовы перыяд (калядны цыкл), веснавы перыяд (масленічныя, песні-вяснянкі, юр’еўскія песні, валачобныя, траецкія, куставыя, русальныя), летні перыяд (жніва, купалле), восеньскія песні; сямейна-абрадавая паэзія (радзінная, вясельная, пахавальныя галашэнні); пазаабрадавая паэзія: лірычныя песні пра каханне, сямейная лірыка, сацыяльна-бытавая лірыка (казацкія песні, рэкруцкія і салдацкія, чумацкія, антыпрыгонніцкія, бурлацкія, батрацкія, прымацкія), балады і прыпеўкі; дзіцячы фальклор і народная проза (калыханкі і забаўлянкі, заклічкі, дзіцячыя песні, лічылкі і гульні, казкі пра жывёл, чарадзейныя, сацыяльна-бытавыя, жарты і анекдоты, легенды і паданні); дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (разьба па дрэве, ганчарства, ткацтва, вышыўка, пляценне, размалёўка, кавальства, народная архітэктура); народны этыкет, эстэтыка паводзін і побыту (эстэтыка жылля, адзення, харчавання, адпачынку, сямейна-бытавая культура, патрабаванні да выхавання дзяцей, правілы паводзін у прыродным асяроддзі).

Разнастайныя віды і жанры і народнага мастацтва з’яўляюцца састаўнымі часткамі зместу эстэтычнага выхавання, сістэмай даступных народу “вучэбных прадметаў”, дзе ў вобразнай форме ўвасоблены спрадвечны сацыяльны вопыт. Усе яны выступалі ва ўзаемасувязі, рэалізоўваліся комплексна: часткай

народных святаў былі не толькі песня, але і харэаграфічная культура, народны тэатр, у значнай ступені – народная музыка і інш. Беларуская народная педагогіка, дзе адсутнічае яўнае раздзяленне эстэтычнага і мастацкага выхавання, а таксама назіраецца сінкрэтызм асноўных жанраў фальклору (вусная паэтычная творчасць, музыка, тэатр, танец, выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва), уяўляе сабой надзвычай разгалінаваную і складаную выхаваўчую сістэму, дзе асобна можна разглядаць музычна-эстэтычнае, харэаграфічна-эстэтычнае, песенна-эстэтычнае выхаванне і г.д. Адно без другога не мыслілася, не ўяўлялася эстэтычнае развіццё асобы без мастацкага выхавання на аснове фальклору, працоўна-эстэтычнага – без асваення народных рамёстваў, якія грунтаваліся на сур’ёзнай працоўнай дзейнасці.

На змест народнага выхавання аказалі істотны ўплыў наступныя выхаваўчыя традыцыі: параўнальна кароткі перыяд дзяцінства, розны падыход да выхавання хлопчыкаў і дзяўчынак, раздзяленне працы і ранняе далучэнне да практычнай дзейнасці. Асноўны змест эстэтычнага выхавання ўключаў веданне большасці фальклорных жанраў, але залежаў ад распаўсюджанасці вуснай народнай творчасці ў пэўнай мясцовасці. У кожнай вёсцы маглі больш разгорнута адзначаць тое або іншае свята (Купалле, Спас, Дзяды, Каляды), што вызначалася і народнымі, і рэлігійнымі традыцыямі.

Выразна выяўляецца полаўзроставая і ўзроставая дыферэнцыяцыя зместу эстэтычнага выхавання, які канкрэтызаваўся з улікам мясцовых, сямейных і асабістых магчымасцей, але, у цэлым, адлюстроўваў абагулены калектыўны вопыт выхавання. Аб узроставай дыферэнцыяцыі яскрава сведчыць існаванне дзіцячага фальклору, які аб’ядноўвае разнастайныя жанры, ствараўся і ўзнаўляўся для самых маленькіх дарослымі, а затым непасрэдна самімі дзецьмі малодшага ўзросту. Роля дзяцей у каляндарна-абрадавым і сямейна-бытавым комплексах даволі выразна акрэслена. У малодшым узросце яны часцей з’яўляліся аб’ектамі абраду (радзіны), яго сведкімі або пасіўнымі ўдзельнікамі (вячоркі). Падросшы, маглі як самастойна выконваць абрады (абходы двароў, калыханне на арэлях), так і ўдзельнічаць у іх разам з дарослымі (вяселле,

жніва), у выніку чаго адбываліся і практычная перадача працоўных і эстэтычных навыкаў, і развіццё эстэтычнай свядомасці, засваенне этыкі і эстэтыкі паводін. Дзіцячы і юнацкі ўзрост з'яўляецца найбольш прыдатным для эстэтычнага выхавання, эмацыянальна-пачуццёвага развіцця. Пры гэтым трэба ўлічваць, што перыяд дзяцінства ў мінулым быў некалькі карацейшым, маладыя людзі даволі рана ўступалі ў шлюб, таму працэс уключэння ў эстэтычную дзейнасць адбываўся надзвычай актыўна.

Згодна традыцыі, кожны ўзрост меў сваю "дзялянку" народнага мастацтва. Дзяўчаты выконвалі пераважна вяснянкі, жанчыны старэйшага ўзросту і маладзіцы – жніўныя і іншыя каляндарна-абрадавыя песні. У карагодах і гульнях удзельнічала моладзь абодвух палоў. Сацыяльна-бытавая лірыка (песні казацкія, рэкруцкія, салдацкія, прымацкія, чумацкія, антыпрыгонніцкія, бурлацкія, батрацкія) выконвалася мужчынамі. Апавядальнікамі народных казак, легенд і паданняў, жартаў і анекдотаў маральна-павучальнага зместу, знаўцамі прыказак і прымавак з'яўляліся пераважна людзі сталага ўзросту.

Галоўная роля ў захаванні і перадачы народнай харэаграфічнай культуры адводзілася жанчыне, паколькі існавала перакананне, што ўмельства да танцаў у дзяўчат з'яўляецца прыроджаным. Аналіз танцавальнай культуры паказвае наяўнасць масавых і сольных, жаночых і мужчынскіх, змешаных танцаў і карагодаў, танцаў з удзелам дзяцей, што дазваляла пазбегнуць аднабаковасці ў эстэтычным выхаванні. Вядомы мужчынскія танцы ("Мікіта", "Жабка", "Мягера", "Таўкачыкі") з трукавымі, акрабатычнымі і спартыўнымі элементамі, часта камічнага характару, дзе патрабаваліся фантазія і імправізацыя. У ігравых танцах і гульнях ("Ланцуг", "Рэпка") прысутнічаюць элементы спаборніцтва ў спрыце, музыкальнасці, хуткасці, што апраўргае даволі распаўсюджаную думку аб суме, элегічнасці беларускай культуры.

У большасці абрадаў, народных святаў заўважаецца больш актыўная роля дзяўчат і жанчын, якія, з'яўляліся асноўнымі носьбіткамі народных традыцый эстэтычнага выхавання. Паэтычнымі і эстэтычна значнымі абрадамі з'яўляюцца

абрады “Куст”, “Ляльнік”, “Русальны тыдзень”, “Тройца”, якія адбываліся без удзелу мужчын. Часткай Траецкіх урачыстасцей быў абрад кумаванне, кумленне (ад лац. cum у саюзе) старажытная форма абрадавага ўстанаўлення прыязных, сяброускіх адносін [2, 280]. Сучаснымі навукоўцамі гэты традыцыйны абрад разглядаецца як жаночая ініцыяцыя, што адзначаў важны перыяд у жыцці дзяўчыны – наступленне шлюбнага ўзросту.

Эстэтычна-магічным сімвалам народных святаў веснавога і летняга цыклаў, якія адбываліся на прыродзе, быў вянок з кветак. Ён з’яўляецца таксама этнічна адметным прадметам дзявочага ўпрыгожання, увогуле ўвасабляе жаночы пачатак. Навык пляцення вянкоў пачынаў фарміравацца з дзяцінства і пастаянна ўдасканальваўся. Дзяўчаты плялі вянкі звычайна ў групе, напрыклад, колькасць удзельніц пляцення вянка ў Русальным абрадзе строга рэгламентавана: 6 або 12 дзяўчат [2, 433]. Гэта дазваляе вылучыць пляценне або віццё вянкоў у нацыянальна адметную групавую форму эстэтычнага выхавання, якая мае выразную палавую дыферэнцыяцыю.

Эстэтыка зімовых святаў у значнай меры вызначалася вядучай роляю мужчын. Падрыхтоўка рэквізіту, стварэнне калядных масак і выкананне галоўных роляў у абрадах калядавання, хаджэння з зоркай, з Казой з’яўлялася прэрэгатывай юнакоў. Мужчынскі склад мелі і вандроўныя гурты беларускіх валачобнікаў. Высока ацэньваўся талент, здольнасці ў галіне музыкі. Музыка ў беларускай традыцыі лічылася мужчынскай справай, жанчына, іграючая на музычным інструменце – нонсенс для народнай культуры. Гэтыя ўяўленні замацаваны ў народных казках (“Музыка”, “Музыка і яшчарка”), у беларускай літаратуры (М. Багдановіч – “Музыка”, Я. Колас – “Сымон-музыка”, Я. Купала – “Курган”).

Стэрэатып мужчынскіх і жаночых паводзін уваходзіў у свядомасць дзіцяці праз забавы і гульні з лялькамі, працу, зносіны з прыродай, непасрэдныя назіранні за паводзінамі членаў сям’і і блізкіх. Падзел значнай часткі народных гульняў на хлапечыя і дзявочыя пры наяўнасці агульных забаў пацвярджае, што народнай педагогіцы ўласцівы пастаянны клопат аб традыцыйным засваенні

сацыяльных роляў, полаўзроставым выхаванні. Шырокавядомыя гульні “Абедкі”, “Хаткі”, “Лялькі” вызначалі ролю хлопчыкаў і дзяўчынак у выкананні працоўных працэсаў, хатніх абавязкаў.

Жаночую і мужчынскую псіхалогію народная педагогіка актыўна фарміруе мастацка-эстэтычнымі сродкамі. Уяўленні аб прыгажосці юнака і дзяўчыны замацаваны ў фальклоры. Народны эстэтычны ідэал выяўлены ў абрадах сватання і вяселля: высока цаніліся працавітасць, цнатлівасць, знешнія дадзеныя маладых, таленты і ўменні ў галіне народнага мастацтва. Але менавіта ўнутраная прыгажосць чалавека, яго душы, дзеянняў, розум і дабрыня ставяцца на першае месца, што пастаянна адзначаецца ў народных прыказках і прымаўках.

Эстэтычная ацэнка знешнасці чалавека грунтавалася на аналогіях, на ўяўленнях аб прыгажосці ў свеце жывёл і птушак, раслін. Увогуле назіралася ўслаўленне натуральнай, прыроднай, а не штучнай, набытай прыгажосці. Для дзяўчыны знешнія дадзеныя лічыліся больш істотнымі, чым для юнака, прэстыж якога вызначаўся роляю галавы сям’і, гаспадара, працаўніка, прадаўжальніка роду, што адпавядала нормам звычаёвага права і падтрымлівалася царквой.

Асаблівае значэнне пры ацэнцы знешнасці дзяўчыны надавалася касе і яе догляду, дзеянням з валасамі, што з’яўлялася паказчыкам выхаванасці, акуратнасці, дэманстравала павагу да акружаючых. Існавала шэраг забарон: раскідваць валасы, надзяваць на галаву мужчынскую шапку. Лічылася, што і “мужчыне не можна надзяваць на голаў жаночае шапкі або хусткі, бо ён будзе вельмі ўсяго палохацца, бы баба” [1, 158]. Выкананне рэгламентацый кантралявалася грамадскай думкай, было абумоўлены народнай медыцынскай і выхаваўча-магічнай практыкай. Дзявочая каса – адзнака знешняй і ўнутранай прыгажосці, эстэтычна-маральнай, фізічнай і інтэлектуальнай дасканаласці, увогуле жаночай і чалавечай сутнасці: “Дзявочая каса – краса. Каса асцерагае дзеўку ат усялякага ліха” [1, 162]. Каса, валасы нярэдка атаясамліваліся ў народным уяўленні з магіяй, любоўнымі чарамі.

Жаданне кахаць, мець дзяцей заахвочвалася ў традыцыйнай культуры, адпаведна гэтаму фарміраваўся ўнутраны свет дзяўчыны, адбывалася эстэтычнае выхаванне. Размовы на інтымныя тэмы народнай педагогікай не ўхваляліся, таму перадаць свае перажыванні можна было найперш эмацыянальна-вобразнай песеннай моваю. Тэма кахання адлюстравана ў народных песнях, казках і легендах.

На практычную арганізацыю эстэтычнага выхавання значны ўплыў аказвала працоўная дзейнасць. Юнакі маглі праявіць свой талент у занятках народнымі рамёствамі (разьба па дрэву, цяслярства, лазапляценне, бондарства, кавальства), цесна звязаных з народным мастацтвам. Эстэтычнаму развіццю дзяўчат садзейнічалі такія значныя для жанчыны заняткі, як вышыванне, ткацтва, пляценне карункаў. Паводле народных уяўленняў, прывабнасць дзяўчыны залежала не толькі ад знешнасці, але і умельства, працоўных навыкаў у галіне народных рамёстваў, эстэтычнага густу, прыгажосці паводзін, ведання традыцый. Засваенне навыкаў прадзення і ткацтва, самастойны выраб паўсядзеннага і святочнага строяў былі не толькі неабходнасцю, але і сродкам самавыражэння.

Змест эстэтычнага выхавання ў народнай педагогіцы рэалізоўваўся на працягу ўсяго жыцця асобы, не меў строгіх узроставых абмежаванняў. Кожны чалавек сутыкаўся з прыгажосцю ў паўсядзённым жыцці, працы і побыце, удзел яго ў народных святах і абрадах не абмяжоўваўся, а з узростам узбагачаўся і дапаўняўся, паколькі на кожным жыццёвым этапе канкрэтная святочная дзея па-новаму эмацыянальна ўспрымалася і асэнсоўвалася. Пры гэтым эстэтычнаму выхаванню дзяўчат аддаваўся прыярытэт, яно было багацейшым па змесце. Менавіта ад жанчыны залежала эстэтыка жылля, адзення, харчавання, маральна-эстэтычнае выхаванне дзяцей. Яна з’яўлялася галоўнай захавальніцай матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей беларускага народа і сваёй мясцовасці.

Літаратура

1. Сержпутоўскі, А.К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / Прадм. У.К. Касько; Маст. В.Р. Мішчанка. – Мінск: Універсітэцкае, 1998. – 301 с.
2. Этнаграфія Беларусі: Энцыкл. – Мн.: БелСЭ, 1989. – 575 с.